артыкулы

**Наталля Рыбак**
(Гродна)

# Дзейнасць і ліквідацыя акаўскіх і постакаўскіх фарміраванняў на Беласточчыне ў святле дакументаў сілавых структур БССР (1944-1947 гг.)

Горад Беласток — з 1939 г. цэнтр Беластоцкай вобласці БССР, быў вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў 27 ліпеня 1944 г. у выніку Беластоцкай наступальнай аперацыі войск Чырвонай Арміі[1]. Аднак, яго далейшая дзяржаўная прыналежнасць да Польшчы была прадвырашана яшчэ да вызвалення. Цікавасць выклікае той факт, што партыйна-савецкія кіраўнікі вобласці імкнуліся супрацьдзейнічаць перадачы часткі вобласці Польшы (гл. дадатак № 1). Але савецкі ўрад праігнараваў іх пазіцыю, а ў вырашэнні пытання аб берaруска-польскай мяжы менш за ўсё ўлічваў інтарэсы беларускага насельніцтва. У выніку, 27 ліпеня 1944 г. урад СССР падпісаў пагадненне з Польскім камітэтам нацыянальнага вызвалення (ПКНВ) аб правядзенні дзяржаўнай мяжы па так званай „лініі Керзана", пры гэтым саступалася на карысць Польшчы тэрыторыя, якая знаходзілася на ўсход ад вышэйадзначанай лініі: а) тэрыторыя да р. Заходні Бугі і Салокія; б) частка Белавежскай пушчы на ўчастку Няміраў — Ялаўка[2]. У верасні 1944 г. Беластоцкая вобласць была скасавана ў сувязі з перадачай большай часткі вобласці ў склад Польшчы. Раёны, якія засталіся ў складзе БССР: Гродзенскі, Ваўкавыскі, Бераставіцкі, Сапоцкінскі, Свіслацкі і Скідальскі, увайшлі ў Гродзенскую вобласць[3].

[1] *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т.*, Мінск 1993, т. 1, с. 490.
[2] *Советский Союз – народная Польша (1944-1974 гг.): Документы и материалы*, ред. коллегия: Н. Н. Родионов, С. Трепчиньский и др., Москва 1974, с. 19.
[3] *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі*, т. 1, с. 491.

Адразу пасля вызвалення адноўленыя сілавыя структуры НКУС — НКДБ БССР пачалі раззбраенне і ліквідацыю фарміраванняў Арміі Краёвай, якая разглядалася імі як нацыяналістычная і контррэвалюцыйная сіла ў рэгіёне. Згодна з „Директивой Ставки Верховного Главнокомандования командующим 1-, 2-, 3-го Белорусских и 1-го Украинского фронтов, командующему вооружёнными силами Польши полковнику М. Роля-Жимерскому, командующему 1-й польской армией (ПА) З. Берлингу об отношении к Армии Крайовой", загадвалася: „Вооружённые отряды, входящие в состав Краевай Армии и другие подобные организации (...) при обнаружении немедленно разоружать. Офицерский состав этих отрядов интернировать, а рядовой младший состав направлять в отдельные запасные батальоны 1 ПА Берлинга. (...) Командующему 1 ПА для этой цели сформировать к 7 августа 1944 г. отдельные запасные батальоны: (...) для 2-го Белорусского фронта в районе Белостока"[4]. У такой сітуацыі кіраўніцтва АК прыняла рашэнне звесці да мінімуму сваю дзейнасць на „kresach wschodnich" і перанесці яе на тэрыторыю Польшчы.

У гэтым артыкуле мы паспрабуем разглядзець дзейнасць некаторых акаўскіх і постакаўскіх фарміраванняў, што прабіліся за „лінію Керзана" і працягвалі ўзброены супраціў на тэрыторыі Беласточчыны, а таксама іх ліквідацыю, якая была здзейснена польскімі органамі бяспекі з дапамогай сілавых структур БССР-СССР на падставе дакументаў апошніх: справаздач, дырэктыў, дакладных запісак і спецыяльных паведамленняў.

Адным з атрадаў, які спачатку дзейнічаў на тэрыторыі БССР, а пасля яе вызвалення пазбег раззбраення, была брыгада З. Шэндзеляжа („Лупашкі"). Пасля загаду аб роспуску АК (19 студзеня 1945 г.), „Лупашка" са сваімі людзьмі пераходзіць за „лінію Керзана" на тэрыторыю Беласточчыны[5]. Там, у красавіку 1945 г. яго брыгада далучылася да АК-АКО (АКО — Armia Krajowa Obywatelska), якую стварыў і ўзначаліў яшчэ ў лютым таго ж года былы камендант Беластоцкай акругі АК Уладзіслаў Лінярскі („Мсціслаў")[6]. Брыгада „Лупашкі" дзейнічала ў непасрэднай блізкасці ад савецка-польскай мяжы ў раёнах 85-га і 12-га пагранатрадаў

[4] Н. Е. Елисеева, *Тылы действующей армии охраняли войска НКВД*, „Военно-исторический журнал" 1998, № 6, с. 16-17.

[5] С. А. Ситкевич, С. А. Сильванович, В. В. Барабаш, Н. А. Рыбак, *Польское подполье на территории западных областей Беларуси (1939-1954 гг.)*, Гродно 2004, с. 297.

[6] В. И. Ермолович, С. В. Жумарь, *Огнём и мечом. Хроника польского националистического подполья в Белоруссии (1939-1953 гг.)*, Мінск 1994, с. 64.

НКУС БССР[7].

На савецка-польскім памежжы дзейнічала і фарміраванне маёра Чэслава Дэмбіцкага („Ярэма”). Напярэдадні вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў „Ярэма” быў шэфам інспектарата Ашмяны „Ф”, камандзірам 3-га (Ашмянскага) злучэння, якое ўваходзіла ў склад Віленскай акругі АК[8]. Злучэнне складалася з 8-ай, 9-ай, 12-ай і 13-ай брыгад, якія налічвалі звыш 2 000 чалавек[9]. Ч. Дэмбіцкі разам са сваімі падначаленымі прымаў удзел у аперацыі „Вострая Брама”. Пасля яе ён пазбег арышту і перадыслакаваўся ў Рудніцкую пушчу[10]. Аднак, 19 жніўня 1944 г. у выніку аперацыі сіл НКУС БССР фарміраванне „Ярэмы” было ліквідавана. У двухгадзінным баі ў раёне вёсак Паддубічы і Баравое акаўцы згубілі забітымі 41 чалавека, палоннымі — 8, сам „Ярэма” быў паранены, але здолеў вырвацца[11]. Праўда, пазней ён таксама быў арыштаваны і з верасня 1944 г. знаходзіўся ў турме ў Вільні, адкуль яго выпусцілі 27 лютага 1945 г. з задачай схіліць да легалізацыі тых удзельнікаў АК, якія знаходзіліся яшчэ ў канспірацыі[12]. Вынікам працы Ч. Дэмбіцкага ў гэтым накірунку сталі перамовы паміж кіраўніцтвам АК і супрацоўнікамі НКУС СССР у Вільні 10 красавіка 1945 г. Палякаў імкнуліся пераканаць у тым, што супраціў бессэнсоўны і толькі выхад з падполля і далейшы выезд на Захад можа выратаваць іх ад знішчэння. Аднак, дасягнуць сваёй мэты НКУС не змог[13]. Летам 1945 г. „Ярэма” быў ужо ў Польшчы і працягваў барацьбу[14].

Такім чынам, знаходзячыся пад пагрозай ліквідацыі, большасць акаўскіх фарміраванняў імкнуліся перадыслакавацца за „лінію Керзана”. Яны пераходзілі новую савецка-польскую мяжу і пра-

[7] Архіў УУС Гродзенскага аблвыканкама, ф. 48, воп. 1, спр. 15, а. 102.

[8] *NKWD o polskim podziemiu 1944-1948. Konspiracja polska na Nowogródczyźnie i Grodzieńszczyźnie*, Warszawa 1997, s. 58; T. Gasztold, *Nad Niemnem i Oszmianką. Z dziejów Armii Krajowej na Wileńszczyźnie i Nowogródczyźnie*, Koszalin 1991, s. 57.

[9] T. Gasztold, *Nad Niemnem i Oszmianką...*, s. 57-58.

[10] Там жа, с. 58.

[11] А. Хацкевич, *Узлы развязывает время: формирования польской Армии Крайовой на территории западных областей Беларуси (1943-1944)*, „Неман” 1994, № 1, с. 144-145; T. Gasztold, *Nad Niemnem i Oszmianką...*, s. 59.

[12] *NKWD o polskim podziemiu 1944-1948...*, s. 68; T. Gasztold, *Nad Niemnem i Oszmianką...*, Koszalin 1991, s.59.

[13] Z. Woźniczka, *Polskie podziemie niepodległościowe (1945-1952)*, „Mówią Wieki” 1991, nr 3, s. 10.

[14] *NKWD o polskim podziemiu 1944-1948...*, s. 68; С. А. Ситкевич, С. А. Сильванович, В. В. Барабаш, Н. А. Рыбак, *Польское подполье на территории западных областей Беларуси...*, с. 297.

цягвалі сваю дзейнасць ужо на тэрыторыі Польшчы. Выхад з „kresów" пачаўся яшчэ летам 1944 г. па загаду Галоўнага камандавання АК, але пік гэтага працэсу прыйшоўся на сярэдзіну 1945 г. Паводле даных Галоўнага ўпраўлення НКУС СССР па барацьбе з бандытызмам за чэрвень 1945 г. „белопольские банды Армии Крайовой получили приказ в ближайшее время собраться в районе г. Лиды Гродненской области, откуда [должны] перейти в Польшу на территорию Белостокского воеводства". Далей паведамлялася, што „в случае столкновения с советскими пограничными войсками банды получили указание пробиваться в Польшу с боем"[15]. Адпаведныя дырэктывы былі разасланы ўсім начальнікам памежных раённых аддзелаў НКУС Гродзенскай вобласці, дзе адзначалася: „В НКВД БССР и УНКВД Гродненской области имеются материалы, свидетельствующие, что белопольские вооружённые банды за последнее время принимают все необходимые меры ухода за границу на территорию Польши с полным вооружением и припасами"[16].

З боем спрабавалі перайсці савецка-польскую мяжу ў чэрвені 1945 г. атрады сяржанта В. Янчэўскага „Лялюся" і падпаручніка Ч. Стэцэвіча „Смелага" Навагрудскай акругі АК. Усе акаўскія структуры, якія рабілі перадыслакацыю на тэрыторыю Польшчы, карысталіся дапамогай 10 абвода Гродна-Правы Нёман АК-АКО. У прыватнасці, вышэйадзначаным атрадам аказвалі неабходную дапамогу 5, 6 і 7 кампаніі 10 абвода[17]. Актыўна выкарыстоўваліся ў якасці праваднікоў мясцовыя жыхары. Так, ураджэнцы Гродзенскага раёна браты Іосіф, Станіслаў і Іван Вашкелевічы на працягу лета 1945 г. былі праваднікамі і сувязнымі атрада „Лялюся" і дапамагалі яму ў падрыхтоўцы пераходу мяжы[18]. 29 чэрвеня 1945 г. „лінію Керзана" перайшоў атрад „Смелага", які да верасня гэтага года працягваў дзейнічаць у Аўгустоўскай пушчы[19]. А 27-28 ліпеня савецка-польскую мяжу перайшоў атрад „Лялюся". У дакументах сілавых структур БССР адзначалася: „ 27 июля 1945 г. вооружённая бандгруппа, возглавляемая комендантом плютона поручиком польской армии по

[15] Архіў УУС Гродзенскага аблвыканкама, ф. 48, воп. 1, спр. 22, а. 79 зв.

[16] Там жа, ф. 48, воп. 1, спр. 15, а. 124.

[17] K. Krajewski, *Obwód Nr 49/67 Szczuczyn-Lida (działalność w 1945)*, „Ziemia Lidzka", Lida, maj 2003, nr 2 (53), s. 22–23.

[18] Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднаняў Гродзенскай вобласці, ф. 1, воп. 1, спр. 174, а. 48-50.

[19] K. Krajewski, *Obwód Nr 49/67 Szczuczyn-Lida...*, s. 23.

кличке „Лялюсь”, численностью 39 человек, на участке 10 и 11 застав 16 погранотряда с полным вооружением ушла на территорию Польши”[20]. Аднак, каля вёскі Красняны (на поўнач ад Саколкі) атрад быў атакаваны сумеснымі польска-савецкімі сіламі, у выніку чаго пацярпеў значныя страты[21]. Няўдала скончылася спроба перасячэння мяжы ў жніўні-верасні 1945 г. і для атрада колькасцю 17 чалавек пад кіраўніцтвам „Бужы”(поўныя асабістыя даныя не высветлены). У выніку сутычкі з сіламі НКУС, якая адбылася 17 верасня 1945 г. на тэрыторыі Поразаўскага раёна Гродзенскай вобласці, было забіта 11 чалавек, у тым ліку і польскі афіцэр „Бужа”, узята ў палон 2 чалавекі, астатнія скрыліся[22]. Пасля правядзення агентурна-следчай работы сілавыя структуры БССР высветлілі, што „Бужа” атрымаў загад аб пераводзе праз мяжу 800 удзельнікаў АК, якія знаходзіліся на тэрыторыі Поразаўскага, Пружанскага, Ваўкавыскага і Зэльвенскага раёнаў Гродзенскай і Брэсцкай абласцей[23].

Акрамя перадыслакацыі на тэрыторыю Польшчы, пераход мяжы акаўцамі ажыццяўляўся для папаўнення зброяй. Так, удзельнікі 8 кампаніі 10 адвода АК рэгулярна хадзілі за мяжу з гэтай мэтай. У маі 1945 г. Браніслаў Аляксейчык, Браніслаў Якімовіч, Іван Якуцэвіч у групе агульнай колькасцю 17 чалавек перайшлі польска-савецкую мяжу. З Польшчы імі было прынесена 13 вінтовак розных сістэм і вялікая колькасць боепрыпасаў[24]. Жыхар вёскі Багатыры-Польныя Сапоцкінскага раёна Станіслаў Сымбула ў красавіку 1945 г. па загаду каменданта 10 абвода „Змяны” пераходзіў савецка-польскую мяжу на захад ад вёскі Волькуш на сутыку 6 і 7 памежных застаў 16 пагранатрада з мэтай забраць на польскім баку зброю для 4, 7 і 8 кампаніяў абвода[25].

У цэлым, па стану на лета 1945 г. Упраўленне пагранічных войскаў НКУС Беларускай акругі адзначала канцэнтрацыю значных сілаў АК і актывізацыю іх дзейнасці на тэрыторыі Польшчы ў сумежных з БССР раёнах, асабліва ў Аўгустоўскіх і Канстанцінаўскіх лясах, Белавежскай пушчы, насупраць участкаў 12-, 15-, 16-, 84-, 85- і 86-га пагранатрадаў[26]. Толькі ў памежнай зоне Польшчы са-

[20] Архіў УУС Гродзенскага аблвыканкама, ф. 48, воп. 1, спр. 15, а. 124.
[21] K. Krajewski, *Obwód Nr 49/67 Szczuczyn-Lida...* , s. 23.
[22] Архіў УУС Гродзенскага аблвыканкама, ф. 46, воп. 1, спр. 2, а. 69-69 зв.
[23] Там жа, ф. 46, воп. 1, спр. 2, а. 69-69 зв.
[24] Архіў УКДБ па Гродзенскай вобласці, спр. 3920, а. 310.
[25] Дзяржаўны архіў грамадскіх аб’яднаняў Гродзенскай вобласці, ф.1, воп.1, спр.136, а.26–26 зв.
[26] Архіў УУС Гродзенскага аблвыканкама, ф. 48, воп. 1, спр. 15, а. 102.

вецкімі пагранічнікамі ў першай палове 1945 г. было „ўлічана" 17 узброенных фарміраванняў АК[27]. Па даных НКУС БССР яны налічвалі да 600 удзельнікаў[28]. Па падліках беларускіх даследчыкаў В. Ермаловіча і С. Жумара ўсяго на Беласточчыне ў лістападзе 1945 г. дзейнічала 35 буйных постакаўскіх атрадаў агульнай колькасцю больш за 2 000 чалавек[29].

Найбольш буйнымі ўзброеннымі фарміраваннямі польскага падполля, на думку супрацоўнікаў НКУС БССР, былі: 1) атрад „Лупашкі", які аперыраваў на тэрыторыі Бельскага павета насупраць 85- і 12-га ўчасткаў пагранатрадаў, колькасцю да 500 чалавек; 2) атрад „Ярэмы" колькасцю да 700 чалавек, які дзейнічаў на тэрыторыі Влодаўскага павета; 3) атрад „Сянона" колькасцю да 500 чалавек, які дзейнічаў на тэрыторыі Бела-Падляшскага павета; 4) атрад Мацьвея Рузгі („Бліскавіца", „Багун"), які аперыраваў на тэрыторыі Сакольскага павета насупраць 84-га ўчастка пагранатрада[30]. Колькасць апошняга па-рознаму падаецца ў крыніцах сілавых структур БССР. Паводле інфармацыі за чэрвень 1945 г. атрад „Бліскавіцы" налічваў да 1 500 чалавек, але ўжо ў ліпені таго ж года паведамляецца толькі аб 130 удзельніках, аб'яднаных у чатыры плютоны (тры баявых і адзін гаспадарчы). Камандаваў атрадам Мацьвей Рузга ці Станіслаў Мялеўскі, паручнік Польскага Войска, ураджэнец Лідскага раёна. Камендантам 1-га плютона быў таксама ўраджэнец Лідскага раёна „Валігура", 2-га плютона — ураджэнец Віленшчыны капрал „Бей", 3-га плютона — зноў ураджэнец Лідскага раёна „Ясень" і 4-га — „Ардэсон" таксама выхадзец з Лідчыны. Атрад быў добра ўзброены: меў вінтоўкі, аўтаматы, ручныя кулямёты сістэмы Дзегцярова і супрацьтанкавае ружжо[31].

Згаданыя атрады разгарнулі ў памежных з БССР раёнах Польшчы актыўную ўзброенную барацьбу. 27 красавіка 1945 г. фарміраванне „Лупашкі" колькасцю 150 чалавек у раёне населеных пунктаў Арэшкава і Вітава забіла двух супрацоўнікаў міліцыі з Бельска[32]. 10 мая 1945 г. гэты ж атрад колькасцю ўжо ў 500 чалавек здзейсніў напад на роту па барацьбе з бандытызмам польскіх унутраных войск, якая дыслакавалася ў Сямятычах. Фарміраванне колькасцю 120 чалавек было разбіта, а яго зброя і транспарт захоплены: 5 руч-

[27] *Пограничные войска СССР (май 1945-1950 г.): Сборник документов и материалов*, Москва 1975, сс. 262.

[28] Архіў УУС Гродзенскага аблвыканкама, ф. 48, воп. 1, спр. 15, а. 87.

[29] В. И. Ермолович, С. В. Жумарь, *Огнём и мечом...*, с. 64.

[30] Архіў УУС Гродзенскага аблвыканкама, ф.48, воп.1, спр.15, а.102.

[31] Там жа, ф. 48, воп. 1, спр. 15, а. 102-102 зв.; а. 138-139.

[32] Там жа, ф. 48, воп. 1, спр. 15, а. 106 зв.

ных кулямётаў, 70 вінтовак і аўтаматаў, 2 аўтамашыны „Студэбекер”[33]. 17 мая „лупашкаўцы” зрабілі напад на Гайнаўку, дзе раззброілі мясцовую міліцыю[34]. 19 мая 1945 г. гэты ж атрад колькасцю да 300 чалавек напаў на ахову чыгуначнага моста праз р. Буг у Сямятычах. Ахова ў складзе 35 жаўнераў Польскага Войска і трох чырвонаармейцаў была захоплена ў палон. Забраўшы 14 скрынак са снарадамі да 44-міліметровай гарматы, акаўцы зніклі ў невядомым напрамку[35]. Паводле даных сілавых структур Польшчы, атрад „Лупашкі” „систематически контролирует дороги Беловежской пущи, ведущие на Беловеж, Гайновку, Наревку”[36].

Галоўнымі аб’ектамі тэрору постакаўскіх структур былі супрацоўнікі органаў улады ПНР розных узроўняў, ваеннаслужачыя Польскага Войска і Чырвонай Арміі, супрацоўнікі міліцыі, а таксама прыхільнікі новай улады з боку мясцовага насельніцтва. Да вышэйзгаданых прыкладаў можна далучыць яшчэ наступныя факты. Так, 25 сакавіка 1945 г. постакаўскі атрад здзейсніў напад на камендатуру міліцыі Бела-Падляшскага павета, раззброіў шэраговых міліцыянтаў, а каменданта забраў з сабой[37]. У той жа дзень яны ж напалі на Забалоцкую валасную міліцыю, разграміўшы іх памяшканне і забраўшы з сабой міліцыянтаў[38]. Яшчэ адзін тэрарыстычны акт адбыўся 25 сакавіка 1945 г. у вёсцы Сморклічы Сямятыцкага павета, падчас якога быў схоплены і забіты раённы ўпаўнаважаны па эвакуацыі Белаглазаў[39]. 6 красавіка 1945 г. постакаўцамі быў забіты камендант валаснай міліцыі ў Славатычах Самчук. Труп апошняга яны кінулі ў р. Буг, а трох міліцыянтаў забралі з сабой[40]. 26 красавіка 1945 г. у тых жа Славатычах былі забіты два супрацоўнікі польскай дзяржбяспекі[41]. У ноч на 3 мая 1945 г. постакаўскае фарміраванне колькасцю да 100 чалавек разграміла камендатуру міліцыі ў Супраслі, пры гэтым, 5 супрацоўнікаў міліцыі былі забіты, а яшчэ 5 — уведзены ў лес[42]. Адначасова са згаданай акцыяй была зроблена засада на аўтамашыну Польскага Войска, якая следавала з Бельска ў Сямятычы. У выніку, быў забіты 1 жаўнер

[33] Там жа, ф. 48, воп. 1, спр. 15, а. 107-107 зв.
[34] *Пограничные войска СССР ...*, с. 168.
[35] Архіў УУС Гродзенскага аблвыканкама, ф. 48, воп.1, спр. 15, а. 102 зв.
[36] Там жа, ф. 48, воп. 1, спр. 15, а.106 зв.
[37] Там жа, ф. 48, воп. 1, спр. 15, а. 106.
[38] Там жа, ф. 48, воп. 1, спр. 15, а. 106.
[39] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4, воп. 29, спр. 828, а. 12.
[40] Архіў УУС Гродзенскага аблвыканкама, ф. 48, воп. 1, спр. 15, а. 106.
[41] Там жа, ф. 48, воп. 1, спр. 15, а. 106 зв.
[42] Там жа, ф. 48, воп. 1, спр. 15, а. 106 зв.

Польскага Войска і 6 цяжка параненых, а машына — разбіта[43].

Маштабам тэрарыстычнай дзейнасці польскага падполля былі напалоханы савецкія прадстаўнікі, якія па службовых абавязках знаходзіліся на тэрыторыі Польшчы. Так, галоўны ўпаўнаважаны СНК па эвакуацыі І. Варвашэня 20 красавіка 1945 г. накіраваў на імя сакратара ЦК КП(б)Б М. Малініна ліст з просьбай выдзеліць вайсковыя часткі для аховы супрацоўнікаў камісіі па эвакуацыі. У лісце адзначалася: „В г. Белостоке активизировались группы аковцев, которые нападают на работников польской власти и наших военнослужащих. Прошу Вашего указания т. Бельченко[44] о выделении охраны в моё распоряжение"[45].

У першай палове 1946 г., у сувязі з падрыхтоўкай выбараў у польскі Сейм, дзейнасць постакаўскага падполля актывізавалася. 28 студзеня 1946 г. быў здзейснены напад на Гайнаўку, падчас якога былі раззброены супрацоўнікі мясцовай міліцыі[46]. У тым жа студзені на ўчастку чыгункі Саколка — Беласток быў разабраны мост[47]. 17 сакавіка 1946 г. постакаўскім атрадам былі захоплены і расстраляны 6 ваеннаслужачых Польскага Войска разам з афіцэрам, а ў ноч на 15 чэрвеня таго ж года ў Тарэспалі акаўцы забілі намесніка каменданта Тарэспальскай пагранкамендатуры Седлярэвіча і яго жонку[48].

Тактыка ўзброенных атрадаў польскага падполля, якія дзейнічалі ў памежнай зоне Беластоцкага ваяводства, зводзілася да правядзення далёкіх рэйдаў, падчас якіх імі ахопліваліся даволі вялікія абшары. З прапагандысцкай мэтай рэйды маглі дапасоўвацца да значных палітычных падзей і выходзіць нават за мяжу Польшчы. Так, у красавіку 1945 г. Упраўленне НКУС па Гродзенскай вобласці атрымала інфармацыю пра канцэнтрацыю на тэрыторыі Польшчы ў прылеглых да мяжы раёнах значнай колькасці польскіх фарміраванняў, якія мелі намер у дзень Канстытуцыі 3 Мая прарвацца на тэрыторыю Гродзенскай вобласці з мэтай здзяйснення тэрарыстычных актаў[49]. Сілавыя структуры БССР мелі інфармацыю і аб тым, што „в восточных районах Белостокского воеводства (Польша) сосредоточился ряд бандитских групп АК, насчитывающих до 600 участников, которые имеют приказ от Белостокского центра АК перейти через границу

[43] Там жа, ф. 48, воп. 1, спр. 15, а. 107.
[44] С. С. Бельчанка – народны камісар унутраных спраў БССР.
[45] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4, воп. 29, спр. 829, а. 45.
[46] *Пограничные войска СССР...* , с. 332.
[47] Там жа.
[48] Там жа.
[49] Архіў УУС Гродзенскага аблвыканкама, ф. 48, воп. 1, спр. 15, а. 95.

на территорию БССР для участия в подготавливающемся восстании"[50]. З аднаго боку такія далёкія рэйды перашкаджалі ліквідацыі ўзброеных фарміраванняў польскага падполля, якія хутка мянялі месца сваёй дыслакацыі, а з другога — стваралі ў мясцовага насельніцтва ўраджанне сталай сваёй прысутнасці ў рэгіёне. Падчас рэйдаў прымаліся дзеянні, накіраваныя як супраць савецкай улады на тэрыторыі БССР, так і супраць ПКНВ (пазней — Часовага ўраду) у Польшчы. Гэтыя дзеянні можна падзяліць на наступныя напрамкі: 1) агітацыя і прапаганда; 2) сабатаж; 3) пагрозы і запалохванне мясцовага насельніцтва, пераважна беларусаў і ўкраінцаў; 4) тэракты ў адносінах да актывістаў, вайскоўцаў (як Чырвонай Арміі, так і Польскага Войска), прадстаўнікоў улады; 5) дыверсіі; 6) збіранне разведдадзеных; 7) рабункі дзяржаўнай і прыватнай маёмасці.

Адным з галоўных напрамкаў барацьбы акаўскіх і постакаўскіх структураў з уладамі „народнай" Польшчы з'яўлялася прапагандысцкая работа. Свае заклікі, ідэі і інфармацыйныя матэрыялы польскае падполле распаўсюджвала ў першую чаргу праз друкаваныя выданні, улёткі, чуткі. Беластоцкая акруга АК-АКО выдавала газету „Monitor Białostocki", нумары якой перапраўляліся на тэрыторыю БССР. Адзін з такіх нумароў ад 4 красавіка 1945 г. быў адабраны супрацоўнікамі НКУС у акаўца Мечыслава Шымчыка пры вобшуку, зробленым у яго хаце ў вёсцы Сіневічы Сапоцкінскага раёна Гродзенскай вобласці. Сярод інфармацыі аб падзеях на Заходнім фронце і міжнароднай сітуацыі ў раздзеле „Sprawy polskie" падымалася пытанне аб савецка-польскай мяжы. У прыватнасці адзначалася, што „Польшча павінна атрымаць суверэннасць сваіх межаў", а „савецкі ўрад імкнецца падпарадкаваць сабе Польшчу" і „душыць польскі народ нараўне з немцамі"[51]. Акрамя гатовых друкаваных выданняў з Польшчы ў БССР паступалі таксама розныя матэрыялы і інфармацыя аб дзейнасці польскага падполля, якія выкарыстоўваліся ў газеце „Wiadomości". Апошняя выдавалася нелегальна ў Гродне 10-ым абводам Беластоцкай акругі АК-АКО. Праз савецка-польскую мяжу карэспандэнцыю для яе перавозіла правадніца цягніка Гродна — Беласток Марыя Гаўрылюк[52].

Акрамя друкаваных выданняў сярод насельніцва памежнай зоны распаўсюджваліся ўлёткі. Так, 25 красавіка 1945 г. у мястэчку

[50] Там жа, ф. 48, воп. 1, спр. 15, а. 87.
[51] Архіў УКДБ па Гродзенскай вобласці, спр. 3933, а. 170.
[52] Архіў УУС Гродзенскага аблвыканкама, ф. 38, воп. 1, спр. 19, а. 24, 27 зв.

Крынкі за подпісам Мацьвея Рузгі былі расклееены ўлёткі, якія заклікалі „весці барацьбу з камуністамі і савецкай уладай" і пагрозамі, што „асобы, якія не выканаюць гэтага, будуць лічыцца здраднікамі"[53]. Гэтым жа атрадам была распаўсюджана ўлётка, у якой пагражалася асобам, якія супрацоўнічаюць з камуністычнай уладай Польшчы (гл. дадатак № 2). Распаўсюджваў улёткі і атрад „Лупашкі". У іх таксама ўтрымліваліся пагрозы тым, хто дапамагаў Часоваму польскаму ўраду[54]. 1 мая 1945 г. у раёне Нараўкі „лупашкаўцы" разам з улёткамі развесілі спісы расстраляных імі актывістаў[55]. Адначасова распаўсюджваліся розныя чуткі: аб непазбежнасці вайны паміж СССР і Англіяй з-за „польскага пытання", змяненні савецка-польскай мяжы на карысць Польшчы, ператварэнні Польшчы ў „17-ую рэспубліку СССР", прымусовай русіфікацыі, ліквідацыі касцёлаў, калектывізацыі і г.д.[56] У якасці прыкладу нярэдка выкарыстоўваліся рэпатрыянты з БССР, якія на сабе зведалі ўсе „даброты" сталінскага рэжыму.

Агітацыйная работа польскага падполля знаходзіла падтрымку сярод даволі значнай часткі польскага насельніцтва. Яна праяўлялася ў зборы і перадачы неабходнай інфармацыі, укрыцці ўдзельнікаў падполля, дапамозе прадуктамі, вопраткай і зброяй. Так, жыхары Бела-Падляшскага павета Розенверт (ці Розенберг) і Кучэрскі (ці Кучэўскі) скуплялі зброю ў ваеннаслужачых і мясцовага насельніцтва, расплачваючыся гарэлкай, прадуктамі і іншымі таварамі[57]. Зброі назбіралася на цэлы пяхотны полк, сфарміраваны з мясцовых жыхароў пад № 34. Аднак, ён хутка быў расфарміраваны польскім урадам[58].

Частка польскага мясцовага насельніцтва прымала непасрэдны ўдзел у супраціве прасавецкаму ўраду ў Польшчы. Так, 17 красавіка 1945 г. постакаўскі атрад колькасцю да 200 чалавек зрабіў напад на чыгуначную станцыю Нараўка Бельскага павета, пры гэтым былі забіты начальнік міліцыі і валасны староста. Па аператыўных даных Упраўлення пагранвойск НКУС Беларускай акругі ў здзяйсненні нападу прымалі ўдзел мясцовы ксёндз Панкоўскі і леснікі Вавіцінскі, Дабравольская, Кісялеўская і Каўшэўская[59]. На бок пад-

[53] Там жа, ф. 48, воп. 1, спр. 15, а. 106 зв.
[54] Там жа.
[55] Там жа.
[56] Там жа, ф. 48, спр. 15, а. 106-107; В. С. Парсаданова, *Советско-польские отношения (1945-1949 г.)*, Москва 1990, с. 28-29.
[57] Архіў УУС Гродзенскага аблвыканкама, ф. 46, воп. 1, спр. 2, а. 80.
[58] Там жа, ф. 46, воп. 1, спр. 2, а. 82.
[59] Там жа, ф. 48, воп. 1, спр. 15, а. 106 зв.

полля пераходзілі нават супрацоўнікі польскай міліцыі. У тым жа красавіку 1945 г. постакаўскім атрадам быў здзейснены напад на гміны Ліпск і Штабін Аўгустоўскага павета, падчас якога быў забіты шэраг гмінных супрацоўнікаў міліцыі, а каля 30 міліцыянтаў разам са зброяй уліліся ў склад згаданага фарміравання[60]. У ноч на 10 сакавіка 1945 г. пры садзейнічанні начальніка турмы ў Бела-Падляшскай былі вызвалены 106 арыштаваных акаўцаў[61]. 9 мая 1945 г. пры дапамозе ўнутранай аховы Беластоцкай турмы быў арганізаваны масавы пабег арыштантаў, пры гэтым з імі збеглі і самыя ахоўнікі, захапіўшы ключы ад камераў[62]. Для вызвалення арыштаваных акаўцаў рабіліся таксама напады на канвоі, якія іх суправаджалі да месца зняволення. Такая аперацыя была праведзена постакаўскімі фарміраваннямі 14 красавіка 1945 г., падчас якой былі забіты 4 супрацоўнікі павятовай міліцыі з Аўгустова, а актыўныя дзеячы падполля — вызвалены[63].

Па-іншаму ставілася да постакаўскіх структур карэннае беларускае і ўкраінскае насельніцтва Беласточчыны і Падляшша. Трэба адзначыць іх варожае стаўленне да польскага антысавецкага падполлья. Гэтая варожасць вынікала ў першую чаргу з таго, што беларусы і ўкраінцы сталі аб’ектам пагрозаў і запалохвання з боку постакаўскіх фарміраванняў. Апошнія асабліва адзначыліся падчас кампаніі па абмене насельніцтвам паміж Польшчай і БССР. Пагражаючы зброяй, акаўцы імкнуліся прымусіць беларусаў і ўкраінцаў хутчэй пакінуць тэрыторыю Польшчы, а іх гаспадаркі падвяргаліся нападам і рабункам. І гэта пры тым, што мясцовыя беларусы і ўкраінцы жылі на сваёй этнічнай тэрыторыі, тады як вялікая частка ўдзельнікаў постакаўскіх фарміраванняў і іх камандзіраў на Беласточчыне былі наплывовым элементам з-за новай савецка-польскай мяжы.

За пагрозамі ішлі дзеянні. Напрыклад, 7 сакавіка 1945 г. у Сядлецкім павеце постакаўскім фарміраваннем колькасцю ў 30 чалавек былі абрабаваны сем’і беларусаў, якія падрыхтаваліся да перасялення ў БССР[64]. А ў Белай-Падляшскай беларусы кожную ноч падвяргаліся рабункам з боку акаўцаў[65]. 26 сакавіка 1945 г. постакаўскі атрад колькасцю ў 20 чалавек зрабіў напад на вёску Крывулька Забалоцкай воласці і, пагражаючы мясцовым жыхарам бе-

[60] Там жа, ф. 48, воп. 1, спр. 15, а. 106 зв.
[61] Там жа, ф. 48, воп. 1, спр. 15, а. 61.
[62] Там жа, ф. 48, воп. 1, спр. 15, а. 107.
[63] Там жа, ф. 48, воп. 1, спр. 15, а. 106 зв.
[64] Там жа, ф. 48, воп. 1, спр. 15, а. 61.
[65] Там жа, ф. 48, воп. 1, спр. 15, а. 61.

ларускай і ўкраінскай нацыянальнасці, прымушаў іх да выезду з Польшчы[66]. Варожасць перарастала ў супраціў постакаўскаму падполлю з боку мясцовых беларусаў і ўкраінцаў, што, у сваю чаргу, з боку першых выклікала тэрор. 7 мая 1945 г. у вёсцы Сольнічкі ў 6 км ад Беластока ў хаце беларуса Данілюка былі забіты 6 чалавек, у тым ліку шафёр Ломжынскай групы СНК БССР па эвакуацыі — Васіль Ільіч Лягейда, 4 — паранена, а сама хата — спалена[67]. 25 мая 1945 г. атрад „Лупашкі" спаліў непадалёк ад Беластока беларускую вёску Тапаляны[68]. 28 сакавіка 1945 г. невызначаны постакаўскі атрад колькасцю да 100 чалавек зрабіў напад на Славатычы, дзе былі забіты дзве ўкраінкі — Аляксандра Сцепанчук і Людміла Дзямінская[69].

Напружаная палітычная сітуацыя, якая склалася ў сувязі з дзеяннем постакаўскіх атрадаў, яскрава адлюстроўваецца ў „Докладной записке о политической обстановке и настроениях в районах, где проживает белорусское, русское и украинское население на территории Польши" ад 30 верасня 1945 г. У дакуменце адзначаецца, што мае месца „повсеместный, безнаказанный разгул банд на территории Белостокского воеводства, каждодневные убийства и грабежи белорусского населения (...) крестьяне-белорусы настолько перепуганы, что многие из них уходят на ночь из дома и прячутся. В некоторых деревнях наших работников просят «не заходите к нам, а то узнают, что вы были, нам не здобровать»"[70].

У гэтай сітуацыі некаторая частка беларускага і ўкраінскага насельніцтва пачала запісвацца на выезд у СССР. Аднак і пасля гэтага тэрор супраць іх не спыняўся. Так, 22 верасня 1945 г. у вёсцы Раманаўка Сямятыцкага павета быў забіты жыхар гэтай вёскі беларус Аляксандр Філіманюк, які ўжо запісаўся на выезд у БССР[71]. Савецка-партыйныя супрацоўнікі ў сваіх справаздачах працягвалі адзначаць вельмі складаную палітычную сітуацыю на Беласточчыне. Так, старшыня СНК БССР П. Панамарэнка ў справаздачнай запісцы ад 2 снежня 1945 г. „О ходе эвакуации русского и белорусского населения из Польши на территорию СССР" адначаў, што „убийства и ограбления белорусского, русского и украинского населения не только не прекращаются, а становятся повседневным яв-

[66] Там жа, ф. 48, воп. 1, спр. 15, а. 106.
[67] Там жа, ф. 48, воп. 1, спр. 15, а. 107.
[68] В. И. Ермолович, С. В. Жумарь, *Огнём и мечом...*, с. 65.
[69] Архіў УУС Гродзенскага аблвыканкама, ф. 48, воп. 1, спр. 15, а. 106.
[70] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4, воп. 29, спр. 828, а. 85-87.
[71] Там жа, ф. 4, воп. 29, спр. 828, а. 87.

лением. По неполным данным, только по 6 районам: Белостокскому, Сокулковскому, Валиловскому, Семятичскому, Бело-Подлясскому и Бельскому в 1945 г. бандитами было убито из белорусского населения 229 человек, уведено в лес 14 человек, ранено 12 человек, ограблено 256 хозяйств (...). 75% убитых, раненых и ограбленных белорусов записались на эвакуацию (...). Рыболовская гмина, банда АК полностью сожгла д. Патоки (60 дворов) за то, что жители изъявили желание эвакуироваться в Советский Союз. Крупные польские банды практически наложили контрибуцию на белорусское население. Так, белорусы д. Цецели Семятичского района, часть крестьян выплачивает контрибуцию, а часть вынуждена скрываться от банд"[72].

Такім чынам, дзейнасць постакаўскіх фарміраванняў на Беласточчыне і на Падляшшы, у адрозненне ад заходніх абласцей БССР, набыла даволі акрэслены антыбеларускі і антыўкраінскі характар.

Для вядзення барацьбы з польскім камуністычным урадам постакаўскаму падполлю патрабаваліся вялікія сродкі. Адной з крыніц іх паступлення былі рабункі як прыватнай, так і дзяржаўнай маёмасці. Рэгулярна рабаваліся крамы Белай-Падляшскай[73]. У лютым 1945 г. у гэтым жа горадзе былі абрабаваны два спіртова-гарэлачныя заводы, адкуль вывезлі звыш 2 тыс. літраў спірту[74]. 14 мая 1945 г. на перагоне чыгункі Гайнаўка — Нараўка быў спынены цягнік, перабіта ахова і разрабавана частка грузу[75]. Адначасова ў Белай-Падляшскай постакаўскі атрад абрабаваў банк, адкуль знікла больш за 5 млн. злотых[76]. 25 мая 1945 г. такі ж лёс спаткаў банк у Саколцы, адкуль акаўцы вынеслі 630 тыс. злотых[77].

Актывізацыя дзейнасці постакаўскага падполля патрабавала павелічэння колькасці асабістага складу ўзброенных фарміраванняў. Паводле даных НКУС БССР, „центром АК активно готовятся командные кадры, создаются склады оружия (...), а также даны указания любой ценой, не взирая на потери в личном составе добывать денежные средства и продукты питания" [78]. Для падрыхтоўкі камандных кадраў ствараліся апорныя пункты. Шэфам аднаго з іх быў Міхаіл Шыманчык („Наварожынскі"). Згаданыя пункты мелі

[72] Там жа, ф. 4, воп. 29, спр. 828, а. 17-18.
[73] Архіў УУС Гродзенскага аблвыканкама, ф. 48, воп. 1, спр. 15, а. 64.
[74] Там жа, ф. 48, спр. 15, а. 65.
[75] *Пограничные войска СССР...* , с. 168.
[76] Там жа, с. 262.
[77] Архіў УУС Гродзенскага аблвыканкама, ф. 48, воп. 1, спр. 15, а. 102 зв.
[78] Там жа, ф. 48, воп. 1, спр. 15, а. 64.

таемныя склады зброі[79]. Акрамя гэтага з 1 сакавіка 1945 г. была абвешчана таемная мабілізацыя мужчын 1910-1911 гадоў нараджэння ў постакаўскія фарміраванні[80]. Постакаўскае падполле выкарыстоўвала таксама вярбоўку новых удзельнікаў. З гэтай мэтай з Польшчы ў прылягаючыя раёны БССР накіроўваліся эмісары пад выглядам афіцэраў-адпуснікоў Польскага Войска, якія праводзілі антысавецкую агітацыю і вярбоўку асабліва сярод польскай моладзі[81]. Для канспірацыі, імітуючы арышт, завербаваных забіралі эмісары, апранутыя ў форму НКУС[82]. Часта акаўскія эмісары накіроўваліся ў БССР пад выглядам „советских граждан, возвращающихся якобы из немецкого плена на прежнее место жительства"[83].

Некаторыя акаўскія структуры камплектаваліся на тэрыторыі Польшчы, з мэтай іх перакідкі ў раёны БССР. Так, у перыяд з ліпеня 1944 г. па пачатак 1945 г. у раёне Тарэспаля базіраваўся 82 полк, вядомы НКУС пад назвай „Брэсцкі". Ён пачаў фарміравацца ў раёне Брэста яшчэ ў перыяд нямецкай акупацыі Беларусі. Пасля вызвалення рэспублікі адышоў на тэрыторыю Польшчы, дзе атрымаў загад праводзіць вярбоўку новых членаў сярод палякаў-перасяленцаў, а таксама палякаў, якія пражывалі ў БССР. З гэтай мэтай, згодна агентурным даным НКУС БССР, былі накіраваны ў раён Брэста 3 эмісары: 1. Пшэсцяк Іван („Юр"), камендант дружыны, капрал жандармерыі; 2. Сінкевіч Браніслаў; 3. яфрэйтар жандармерыі Лорэнц („Швейцарачала"). Пасля завяршэння камплектацыі, 82 палку загадвалася вясной 1945 г. невялічкімі групамі перайсці на тэрыторыю Брэсцкай вобласці для вядзення ўзброенай барацьбы супраць савецкай улады[84].

Постакаўскім падполлем ставілася задача выкарыстоўваць таксама ўсе легальные магчымасці для вядзення барацьбы, „стараться завладеть всеми отраслями жизни временного правительства [у Польшчы]"[85]. Паводле радыёграмы, перахопленай НКДБ СССР, польскае антыкамуністычнае падполле павінна было „внедрять членов своих организаций в учреждения временного правительства для проведения подрывной работы"[86]. Адным з напрамкаў дзейнасці постакаўскага падполля быў сабатаж мерапрыемстваў, якія право-

[79] Там жа.
[80] Там жа.
[81] Там жа.
[82] Там жа, ф. 48, воп. 1, спр. 22, а. 139.
[83] Там жа, ф. 48, воп. 1, спр. 15, а. 46.
[84] Там жа, ф. 48, воп. 1, спр. 15, а. 25.
[85] Там жа, ф. 48, воп. 1, спр. 15, а. 31.
[86] Там жа.

дзіліся новай уладай. Напрыклад, атрад „Лупашкі" затрымліваў жыхароў Белавежы, Гайнаўкі і Нараўкі, „идущих на общественные работы и возвращают их домой"[87].

Актыўная дзейнасць акаўскага і постакаўскага падполля выклікала рэакцыю ў адказ з боку польскіх органаў улады. Армія, унутраныя і памежныя войскі, а таксама міліцыя былі накіраваны для ліквідацыі антыўрадавага падполля. Дапамагалі сваім калегам супрацоўнікі сілавых структур СССР, якія на гэты момант назапасілі велізарны вопыт барацьбы з антысавецкімі арганізацыямі і іх узброеннымі фарміраваннямі. Пры непасрэдным удзеле чэкістаў былі створаны, узброены і абучаны польскія службы бяспекі. У перыяд з 1945 г. па 1946 г. унутраныя войскі НКУС-МУС СССР дзейнічалі ва ўсходніх ваяводствах Польшчы, дапамагалі весці барацьбу з польскім падполлем, ахоўвалі савецка-польскую мяжу, абменьваліся разведданымі з польскімі службамі бяспекі.

Комплекс мерапрыемстваў, прадпрынятых для ліквідацыі акаўскіх і постакаўскіх структур (г.зв. чэкісцка-вайсковыя аперацыі, агентурна-следчая і агітацыйная работы) вымушалі апошніх часта мяняць месца дыслакацыі. Так, злучэнне „Лупашкі" ў верасні 1945 г. пакінула тэрыторыю Беластоцкага ваяводства і перадыслакавалася ў Ольштынскае і Гданьскае ваяводствы[88]. Некаторыя постакаўскія фарміраванні, асабліва ў складзе якіх пераважалі выхадцы з Заходняй Беларусі, наадварот, імкнуліся прарвацца праз мяжу, на тэрыторыю БССР. Гэта адзначалася і ў дакументах сілавых структур рэспублікі: „Польское временное правительство усилило борьбу по ликвидации действующих банд АК в связи с чем бандитские элементы небольшими группами прорываются через линию гос. границы на территорию БССР"[89]. Так, атрад Мацьвея Рузгі, які складаўся ў большасці з ураджэнцаў і жыхароў Лідскага раёна Гродзенскай вобласці, спрабаваў прарвацца ў БССР[90]. 4 чэрвеня 1945 г. польская група колькасцю 4 чалавекі спрабавала перайсці мяжу на ўчастку 6368, але ў выніку 2 акаўцы былі затрыманы[91]. 13 чэрвеня 1945 г. аналагічную спробу здзейсніў яшчэ адзін польскі атрад у складзе 16 чалавек на ўчастку 4 заставы 16 пагранатрада (Гродзенская вобласць). Ён углыбіўся

[87] Там жа, ф. 48, спр. 15, а. 106 зв.
[88] *NKWD o polskim podziemiu 1944-1948...* , s. 30-31.
[89] Архіў УУС Гродзенскага аблвыканкама, ф. 48, воп. 1, спр. 15, а. 115.
[90] Там жа, ф. 48, воп. 1, спр. 15, а. 139.
[91] Там жа, ф. 48, воп. 1, спр. 15, а. 115.

на тэрыторыю БССР на 250-300 метраў. Аднак, трапіўшы на засаду савецкіх памежнікаў, з боем павярнуў назад[92]. У гэты ж дзень беларускія памежнікі вышэйадзначанай заставы былі абстраляны з тэрыторыі Польшчы кулямётным агнём[93]. Намеры вярнуцца меў таксама атрад польскага афіцэра „Саломы", які да сярэдзіны 1945 г. дзейнічаў на тэрыторыі Бераставіцкага раёна Гродзенскай вобласці, а потым пад пагрозай знішчэння вымушаны быў перадыслакавацца ў Польшчу. Сілавыя структуры БССР ад сакрэтнага паведамляльніка атрымалі інфармацыю, што вышэйадзначаная група імкнецца перайсці польска-савецкую мяжу ў канцы снежня 1945 г., каб адсвяткаваць каталіцкае Божае Нараджэнне разам са сваімі сем'ямі, якія ў асноўным пражывалі на Гродзеншчыне[94]. Адчувалася стомленнасць людзей, расло іх імкненне вярнуцца да мірнага жыцця. Апошняму спрыяла абвешчаная ў жніўні 1945 г. урадам Польшчы амністыя. Да сярэдзіны 1945 г. выйшлі з падполля, згодна з афіцыйнымі данымі, каля 30 тысяч яго ўдзельнікаў[95]. Сярод іх быў і Ч. Дэмбіцкі („Ярэма")[96].

Для канчатковага знішчэння антыўрадавага постакаўскага і ўкраінскага падполля Генеральны штаб Войска Польскага распрацаваў у 1946 г. адмысловы план, які ад імя аўтара-распрацоўшчыка брыгаднага генерала Стэфана Мосара, намесніка начальніка генштаба, атрымаў назву „план Мосара". Па інфармацыі сілавых структур Польшчы, уздоўж савецка-польскай мяжы, у паласе працягласцю 150 кіламетраў было сканцэнтравана 15 тысяч польскіх і ўкраінскіх паўстанцаў. Згодна з планам прадугледжвалася адначасовае правядзенне маштабных аперацый па ўсёй краіне з выкарыстаннем спецыяльнай тактыкі барацьбы з партызанскімі злучэннямі. Прадугледжвалася таксама адначасовае правядзенне аперацый савецкімі спецслужбамі ўздоўж мяжы на тэрыторыі БССР, каб пазбегнуць пераходу праз яе. „План Мосара" быў прыняты Часовым урадам Польшчы і пачаў ажыццяўляцца з красавіка 1946 г. Мэта — як мага хутчэй ліквідаваць антыўрадавае падполле — была яшчэ абумоўлена і тым, што 27 красавіка 1946 г. Краёвая рада нарадовая прыняла закон „Аб рэферэнду-

[92] Там жа.
[93] Там жа.
[94] Там жа, ф. 47, воп. 1, спр. 22, а. 80.
[95] С. Н. Ткаченко, *Повстанческая армия (тактика борьбы)*, Минск 2000, с. 40.
[96] T. Gasztold, *Nad Niemnem i Oszmianką...* , s. 59.

ме", які быў прызначаны на 30 чэрвеня таго ж года. Падрыхтоўка да рэферэндуму выклікала актывізацыю агітацыйнай і тэрарыстычнай дзейнасці польскага падполля.

„План Мосара" аказаўся даволі эфектыўным. Высокую адзнаку вынікам праведзенай аперацыі і наогул дзейнасці сілавых структур Польшчы дае сакратарыят ЦК Польскай аб'яднанай рабочай партыі ў рэзалюцыі „по вопросам работы польских органов безопасности" ад 2 сакавіка 1949 г., накіраванай у Маскву В. М. Молатаву і І. В. Сталіну. Згодна з ёй, „Министерство общественной безопасности (МОБ) сумело отбить атаки врага в 1945-1946 г., а в 1947-1948 г. разгромить подполье ВИН и НСЗ[97], содействовать разоблачению и разгрому Миколайчиковского ПСЛ[98]"[99]. Адначасова былі высветлены значныя памылкі і недахопы. Сярод іх у запісцы адзначаліся „недостаточная действенность применявшихся до сих пор методов борьбы с бандитизмом (большое число операций со слабым результатом), сравнительно незначительное, по сравнению с количеством проведенных операций, число ликвидированных банд, недостаток информации о намерениях врага (...). Недостатки в организационной структуре МОБ и стиле работы. Основной ошибкой в методах работы является существующая (...) недооценка решающей роли агентуры. Во всех центрах врага (иностранная разведка, организации ВИН, НСЗ, клир) агентура незначительна в количественном и малоценна в качественном отношении"[100]. З мэтай ліквідацыі адзначаных пралікаў неабходна было: „а) добиться перелома в области вербовки высокоценной агентуры в наиболее важных жизненных центрах врага. В дополнении к агентурной сети должна быть разветвлённая информационная сеть; б) разрешить проблему координации всей оперативной работы МОБ. Выработать и представить изменения в структуре и аппарате МОБ. Поднять уровень кадрового обучения (...); в) закрыть наглухо границы республики; г) усовершенствовать методы борьбы с бандами, прежде всего путём развёртывания агентуры в деревне и улучшения разведки; д) развернуть сеть пунктов охраны (...) наиболее важных экономических объектов, укрепить агентурно-информационную сеть; е) реорганизовать как систему, так и методы охраны правительства (...); ж) разрабатывать наиболее активные элементы клира (...); з) в профилактических целях разрабатывать среду исключённых из

[97] „*Wolność i Niezawisłość*" i „*Narodowe Siły Zbrojne*".
[98] „*Polskie Stronnictwo Ludowe*".
[99] *Słownik historii Polski*, pod red. A. Chwalby i T. Gąsowskiego, Kraków 1996, s. 24-25.
[100] Tamże, s. 25-26.

партий ВРНовских[101] и АКовских элементов"[102].

Такім чынам, на дадзеным этапе змагання з постакаўскім падполлем загадвалася асноўную ўвагу надаваць агентурна-следчай рабоце, а чэкісцкія аперацыі праводзіць пасля папярэдняй агентурнай распрацоўкі. Акрамя гэтага, польскім урадам 22 лютага 1947 г. паўторна быў прыняты закон аб амністыі. У органы дзяржбяспекі з 25 лютага па 25 красавіка 1947 г. з'явілася 59,5 тысяч чалавек, у асноўным удзельнікі ВІН, а ўсяго ў 1944-1947 гг. з падполля выйшла звыш 100 тысяч чалавек. Колькасць акцый, праведзеных антыўрадавымі структурамі ў маі 1947 г. зменшылася ў чатыры разы ў параўнанні з лістападам 1946 г.

Скарачэнне дзейнасці польскага падполля ў памежнай паласе ў 1946-1947 гг. таксама адзначалі і савецкія памежнікі. У дакладзе начальніка памежных войск Беларускай акругі генерал-маёра Антонава паведамлялася: „К концу 1946 г. диверсионно-террористические проявления резко снизились, уменьшилось количество и численный состав банд, в Сувалковском и Августовском уездах была приостановлена деятельность организаций ПСЛ, тесно связавшихся с бандитскими группами ВИН"[103]. У дакументах сілавых структур БССР гэта тлумачылася нармалізацыяй палітычнага і эканамічнага жыцця ў Польшчы: аднаўленнем гаспадаркі, правядзеннем рэпатрыяцыі, умацаваннем мясцовых органаў улады і дзяржбяспекі, дэмаркацыяй дзяржаўнай мяжы, а таксама ўмацаваннем пазіцый польскага ўрада і ўзмацненнем яго ўплыву на насельніцтва[104].

Яшчэ большым „аптымізмам" вызначаўся даклад таго ж генерал-маёра Антонова аб становішчы на ўчастку мяжы Беларускай акругі ў 1947 г., згодна з якім „в результате упрочения позиций демократических сил и улучшения экономической жизни Польши, а также принятия 22 февраля 1947 г. польским Сеймом закона об амнистии подрывная деятельность польского подполья в Польше, и в частности в её пограничной полосе против участка государственной границы Белорусского округа, резко сократилась. Значительно сократились и бандпроявления. В польской пограничной полосе на территории Белостокского воеводства бандформирований нет. За пределами пограничной полосы в Бельском и Высоко-

[101] *„Polska Partia Socjalistyczna – Wolność Równość Niepodległość"*.
[102] *Słownik historii Polski*, s. 26-28.
[103] *Пограничные войска СССР...* , с. 333.
[104] Там жа, с. 332.

Мазовецком уездах продолжает оперировать бандгруппа „Млота”, входившая в 1944-1945 гг. в известное бандформирование „Лупашко”. Банда действует семью самостоятельными группами под общим руководством „Млота”. Главарь банды скрывается в лесах Седлецкого уезда Варшавского воеводства. В пограничной полосе отмечались лишь единичные случаи проявления этой банды. В Ломжинском уезде Белостокского воеводства оперирует банда „Роля”, состоящая из 12-15 человек. Бандгруппы „Млота” и „Роля” входят в состав „Народовы звёнзэк войсковы”[105].

Такім чынам, польскае падполле на працягу 1944-1947 гг. знаходзілася пад пільнай увагай сілавых структур СССР-БССР, якія актыўна дапамагалі сваім польскім калегам арганізаваць барацьбу з ім. Апошнія нават на ўзроўні кіраўніцтва Польскай рабочай партыі, інфармавалі савецкія спецслужбы аб стане гэтай барацьбы і наогул аб падзеях, якія адбываліся ў іх краіне. У святле дакументаў сілавых структур БССР акаўскія і постакаўскія фарміраванні дзейнічалі да 1947 г. У разгледжаных крыніцах яны называліся „бандфарміраваннямі”, „белапалякамі” ці „польскімі нацыяналістамі”. Пасля ліквідацыі іх асноўных сіл і пераходу рэштак польскага падполля да больш канспіратыўнай дзейнасці яно амаль перастала згадвацца ў савецкіх дакументах. Тым не меньш, апошнія, нягледзячы на сваю лаканічнасць, неаб’ектыўнасць і адрывачнасць з’яўляюцца важнай крыніцай для вывучэння польскага антысавецкага падполля ў пасляваенны час.

## Дадатак № 1.

**Докладная записка**

Председателю Совнаркома БССР и секретарю ЦК КП(б)Б
т. Пономоренко

Западнее линии Керзона находится Бельский район Белостокской области БССР. В Бельском районе (у. г. Бельск) в 1941 г. насчитывалось 48 662 жителей, а белорусов из них было 28 184 человек. Таким образом, белорусы составляли 57,9% населения Бельского района, т.е. преобладающее большинство. Поляков в Бельском районе всего лишь 15 353 человек или 31,5% населения района, т.е. меньше 1/3 населения.

В Заблудовском районе Белостокской области белорусы состав-

[105] Там жа, с. 357.

ляют приблизительно половину населения.

В Белостокском районе белорусов живёт 8 300 человек или 14,1%. Поляков в Белостоке в 1941 г. жило 39 114 человек, а всего населения в Белостоке было 116 тысяч человек. Таким образом, поляки составляли 33,7% населения города, т.е. приблизительно третью часть, а большую часть составляли русские, белорусы и евреи. Г. Заблудов, Супрасль, Бельск, Белосток входили в Берестейское княжество (таким образом, это старинные белорусские земли).

Всё это даёт веские доводы для того, чтобы просить Вас поставить вопрос перед Советским правительством о том, чтобы во время переговоров с Польшей о границе между ней и СССР требовать оставления г. Белостока, Белостокского, Бельского и Заблудовского районов в составе СССР.

Председатель исполкома Белостокского областного Совета Депутатов трудящихся Ратайко

Секретарь Белостокского обкома КП(б)Б Эльман

8 июля 1944 г.

*Крыніца: Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гродзенскай вобласці, ф. 1, воп. 1, спр. 11, а. 1-3.*

## Дадатак № 2

**Копия листовки.**

Комендант лесных отделов
дня 22.4.45 г.

Предупреждение

Агенты польской партии работничей (читай: партии коммунистической) — начинают кружить по деревням и местечкам и пробуют организовать коммунистические ячейки.

Не поддавайтесь обману коммунистической заразы!

Агенты будут беспощадно уничтожаться. Известны фамилии тех, кто сотрудничает с коммунистическими агентами. Настало время повернуться с фальшивого пути. Фамилии лиц, которые не порвут контакта с ППР будут в ближайшее время поданы для публичного сведения, что одновременно будет равносильно вынесению им смертного приговора.

Хотим Польши, но не Красной — коммунистической, но Польши свободной, независимой, католической.

Да здравствует польский народ!

Да здравстует Польша!

(Матей Рузга)

*Крыніца: Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4, воп. 29, спр. 828, а. 54.*

**Літаратура і крыніцы:**


1. *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т.*, Мінск 1993, т. 1, с. 494; 1996, т. 3, с. 527.
2. *Советский Союз – народная Польша (1944-1974 гг.): Документы и материалы*, ред. коллегия: Н. Н. Родионов, С. Трепчиньский и др., Москва 1974, сс. 664.
3. Н. Е. Елисеева, *Тылы действующей армии охраняли войска НКВД*, „Военно-исторический журнал" 1998, № 6, с. 16-25.
4. В. И. Ермолович, С. В. Жумарь, *Огнём и мечом. Хроника польского националистического подполья в Белоруссии (1939-1953 гг.)*, Мінск 1994, сс. 112.
5. Архіў УУС Гродзенскага аблвыканкама.
6. *NKWD o polskim podziemiu 1944-1948. Konspiracja polska na Nowogródczyźnie i Grodzieńszczyźnie*, Warszawa 1997, s. 404.
7. T. Gasztold, *Nad Niemnem i Oszmianką. Z dziejów Armii Krajowej na Wileńszczyźnie i Nowogródczyźnie*, Koszalin 1991, ss. 156.
8. А. Хацкевич, *Узлы развязывает время: формирования польской Армии Крайовой на территории западных областей Беларуси (1943-1944)*, „Неман" 1994, № 1, с. 136-150.
9. Z. Woźniczka, *Polskie podziemie niepodległościowe (1945-1952)*, „Mówią Wieki" 1991, nr 3, s. 9-13; nr 4, s. 35-40.
10. K. Krajewski, *Obwód Nr 49/67 Szczuczyn-Lida (działalność w 1945)*, „Ziemia Lidzka", Lida, maj 2003, nr 2 (53), s. 19–23.
11. Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднаняў Гродзенскай вобласці.
12. Архіў УКДБ па Гродзенскай вобласці.
13. *Пограничные войска СССР (май 1945-1950 г.): Сборник документов и материалов*, Москва 1975, сс. 759.
14. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь.
15. В. С. Парсаданова, *Советско-польские отношения (1945-1949 г.)*, Москва 1990, сс. 192.
16. С. Н. Ткаченко, *Повстанческая армия (тактика борьбы)*, Минск 2000, сс. 512.

17. *Słownik historii Polski*, pod red. A. Chwalby i T. Gąsowskiego, Kraków 1996, ss. 256.
18. *Восточная Европа в документах российских архивов. 1944-1953 гг.* Москва –Новосибирск 1998, т. 2 (1949-1953), сс. 1004.
19. С. А. Ситкевич, С. А. Сильванович, В. В. Барабаш, Н. А. Рыбак, *Польское подполье на территории западных областей Беларуси (1939-1954 гг.)*, Гродно 2004, сс. 344.

**Streszczenie**

W lipcu 1944 r. działacze reprezentujący aparat partyjny obwodu białostockiego, utworzonego w 1939 r., domagali się od władz centralnych ZSRR pozostawienia całego obwodu w granicach Białorusi Radzieckiej. Zgodnie z obowiązująca dyrektywą Ludowego Komisariatu Spraw Wewnętrznych oddziały Armii Krajowej miały być rozbrojone, żołnierze zmobilizowani do armii Berlinga, oficerowie internowani. Dlatego tuż po wyzwoleniu Białostocczyzny rozpoczęto likwidację struktur AK. Chociaż większość obwodu znalazło się ostatecznie w granicach Polski, radzieckie służby bezpieczeństwa uważnie obserwowały działalność poszczególnych oddziałów akowskiego i postakowskiego podziemia. Usprawiedliwiano te działania faktem przekraczania granicy państwowej ZSRR przez uzbrojone grupy z Białorusi i Wileńszczyzny. Największy oddział, według dokumentów NKWD, Zygmunta Szyndzielarza „Łupaszki", liczący ponad 500 partyzantów, działał w powiecie bielskim w gminach zamieszkałych przez ludność białoruską. Z dokumentów NKWD wynika, że wiedza, jaką dysponowały służby radzieckie na temat polskiego podziemia na Białostocczyźnie była dość kompletna. Odnotowywano niemal każdy napad na instytucje władzy państwowej, niemal każdy przypadek represji wobec osób współpracujących lub podejrzewanych o współpracę z polską władzą komunistyczną. Policzono, że w 1945 r. partyzanci zabili 229 Białorusinów, mieszkańców Białostocczyzny i prawosławnych mieszkańców z okolic Białej Podlaskiej. Do 1946 r. oddziały NKWD bezpośrednio wspierały polskich komunistów w likwidacji zbrojnego podziemia.